ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэннем педагагічнага савета
ад 30.08.2016 г., пратакол № 1
Загад ад 30.08.2016 г. № ___

# Палажэнне аб метадычным аб'яднанні установы адукацыі

## I. Агульныя палажэнні

Метадычнае аб'яднанне (МА) з'яўляецца асноўным структурна-прафесіянальным падраздзяленнем установы адукацыі, якое ажыццяўляе правядзенне вучэбнай, метадычнай, даследча-эксперыментальнай работы па аднаму ці некалькіх вучэбных прадметах.

МА арганізуецца пры наяўнасці трох і больш настаўнікаў па аднаму вучэбнаму прадмету ці па адной адукацыйнай вобласці. У склад МА могуць уваходзіць настаўнікі сумежных вучэбных прадметаў.

Настаўнікі, якія ўваходзяць у склад МА, ажыццяўляюць падрыхтоўку вучняў па вучэбных прадметах адпаведнай адукацыйнай вобласці.

Вучэбную, метадычную, даследча-эксперыментальную работу МА ажыццяўляе на аснове гэтага палажэння, Кодэкса РБ аб адукацыі, загадаў і іншых нарматыўных прававых дакументаў Міністэрства адукацыі і рэгіянальных органаў упраўлення адукацыі, устава ўстановы адукацыі.

## II. Мэты і задачы дзейнасці метадычнага аб'яднання

МА як структурнае падраздзяленне ўстановы адукацыі ствараецца для рашэння вызначаных мэтаў і задач:

- задавальнення патрэбнасці навучэнцаў у маральным, інтэлектуальным і культурным развіцці;
- арганізацыя і правядзенне на высокім прафесіянальным узроўні вучэбнай, метадычнай і даследчай работы па адной або некалькіх роднасных дысцыплінах;
- удасканаленне методыкі правядзення разнастайных відаў заняткаў і іх вучэбна-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння;
- павышэнне педагагічнай кваліфікацыі настаўнікаў;
- правядзенне педагагічных эксперыментаў;
- арганізацыя і правядзенне работы па прафесіянальнай арыентацыі выпускнікоў і падрыхтоўкі іх да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

## III. Асноўныя накірункі дзейнасці метадычнага аб'яднання:

- аналіз вынікаў адукацыйнай дзейнасці па вучэбных прадметах;
- удзел у распрацоўцы варыятыўнай часткі вучэбных планаў, унясенне змен у патрабаванні да мінімальнага аб'ёму і зместу вучэбных курсаў;
- распрацоўка інтэгрыраваных вучэбных праграм па вучэбных прадметах і ўзгадненне іх з вучэбнымі праграмамі іншых адукацыйных абласцей для больш поўнага забеспячэння засваення вучнямі дзяржаўных адукацыйных стандартаў;
- падрыхтоўка і абмеркаванне рукапісаў вучэбна-метадычных дапаможнікаў і

дыдактычных матэрыялаў па вучэбных прадметах;
- правядзенне адкрытых заняткаў і адкрытых пазакласных мерапрыемстваў па вучэбных прадметах;
- абмеркаванне методыкі правядзення асобных відаў вучэбных заняткаў і зместу дыдактычных матэрыялаў да іх;
- разгляд пытанняў арганізацыі, кіраўніцтва і кантролю даследчай работы вучняў;
- арганізацыя правядзення педагагічных эксперыментаў па пошуку і ўкараненні новых тэхналогій навучання;
- узаемныя наведванні заняткаў як унутры МА, так і паміж настаўнікамі розных метадычных фарміраванняў з мэтай абмену вопытам і ўдасканалення методыкі выкладання вучэбных прадметаў;
- сумесныя пасяджэнні з роднаснымі метадычнымі фарміраваннямі з мэтай вывучэння і абмену вопытам работы;
- арганізацыя стажорскай практыкі, настаўніцтва ва ўстанове адукацыі;
- удзел у распрацоўцы палажэнняў аб правядзенні конкурсаў, алімпіяд, спаборніцтваў па прадметах.

**IV. Арганізацыя работы метадычнага аб'яднання**

Узначальвае МА кіраўнік, які назначаецца дырэктарам установы адукацыі з ліку найбольш вопытных і аўтарытэтных педагогаў па згодзе з членамі МА.

Работа МА праводзіцца ў адпаведнасці з планам работы на бягучы навучальны год. План складаецца кіраўніком МА пры непасрэдным удзеле настаўнікаў, якія ўваходзяць у яе склад, разглядаецца на пасяджэнні метадычнага аб'яднання, узгадняецца метадычным саветам, зацвярджаецца дырэктарам установы адукацыі .

Пасяджэнні МА праводзяцца не радзей аднаго раза ў чвэрць. Па кожнаму з абмяркоўваемых на пасяджэнні пытаннях распрацоўваюцца рашэнні,якія носяць рэкамендацельны характар. Рашэнні фіксуюцца ў пратаколе. Пратакол вядзецца ў кароткай форме, падпісваецца і фіксіруецца кіраўніком МА. Пры разглядзе пытанняў, якія закранулі тэматыку або інтарэсы іншых вучэбных метадычных фарміраванняў, на пасяджэнні запрашаюцца іх кіраўнікі (настаўнікі).

**V. Дакументацыя метадычнага аб'яднання**

Для работы МА неабходны наступныя дакументы:
- Загад аб адкрыцці МА і назначэнні кіраўніка;
- Палажэнне аб МА;
- Функцыянальныя абавязкі кіраўніка МА;
- Аналіз работы за мінулы год;
- Тэмы пасяджэнняў МА, іх мэта вызначаецца прыярытэтнымі напрамкамі і задачамі на новы навучальны год;
- План работы МА на бягучы навучальны год;
- Банк дадзеных аб настаўніках МА: колькасны і якасны склад (узрост, адукацыя, спецыяльнасць, прадмет, які выкладае, агульны стаж педагагічны, кваліфікацыйная катэгорыя, узнагароды, званні, дамашні тэлефон);
- Звесткі аб тэмах самаадукацыі настаўнікаў МА;
- Перспектыўны план павышэння кваліфікацыі настаўнікаў МА;
- Графік павышэння кваліфікацыі настаўнікаў МА на бягучы год;

- Звесткі аб прафесійных патрэбнасцях настаўнікаў МА;
- Праграмы (аўтарскія па прадмету, факультатыўным занятку, занятку па інтарэсах);
- Інфармацыя аб вучэбных праграмах і іх вучэбна-метадычным забеспячэнні па прадмету. Каляндарна-тэматычнае планаванне (па прадмету; па індывідуальных, факультатыўных занятках, заняткаў паінтарэсах па прадмету);
- Пратаколы пасяджэння МА.

**VI. Правы і абавязкі МА**

МА мае права:
- рыхтаваць прапановы і рэкамендаваць настаўнікаў для павышэння кваліфікацыйнай катэгорыі;
- вылучаць прапановы аб удасканаленні адукацыйнага працэсу;
- ставіць пытанне аб публікацыі матэрыялаў аб перадавым педагагічным вопыце, які накоплены МА;
- уносіць прапановы па арганізацыі і зместу атэстацыі настаўнікаў;
- вылучаць ад МА настаўнікаў для ўдзелу ў конкурсах "Настаўнік года" і "Класны кіраўнік";
- рэкамендаваць настаўнікам разнастайныя формы павышэння кваліфікацыі;
- звяртацца за кансультацыямі па праблемах вучэбнай дзейнасці і выхавання вучняў да кіраўніцтва ўстановы адукацыі;
- ставіць перад кіраўніцтвам пытанне аб заахвочванні настаўнікаў МА за высокія вынікі прафесіянальнай работы;
- рекамендаваць настаўнікаў да ўдзелу ў органах кіравання ўстановы адукацыі;

Метадычнае аб'яднанне павінна:
- ведаць нарматыўныя прававыя дакументы Міністэрства адукацыі, рэгіянальных кіруючых структур па пытаннях адукацыі, выхавання і абароны правоў навучэнцаў, арганізацыі адукацыйнага працэсу, метадычнай работы;
- кіравацца ў сваёй рабоце дадзеным палажэннем;
- ажыццяўляць работу ў адпаведнасці з зацверджаным планам;
- несці адказнасць за вынікі і якасць сваёй работы.